# Раіса Андрэеўна Баравікова

вядомая беларуская пісьменніца і перакладчыца.



# Жыццёвы шлях



Нарадзілася 11 мая 1947, ў вёсцы Пешкі, Бярозаўскага раёна, Брэсцкай вобласці ў сям'і служачага. Скончыўшы ў **1965** годзе сярэднюю школу, працавала ў Быхаўскай раённай газеце «Маяк Прыдняпроўя»

У той час Раіса марыла прысвяціць сябе журналісцкай справе. Сустрэча з паэтам Аляксеем Пысіным змянілі яе планы. Ён пераканаў паэтэсу паступіць у Літаратурны інстытут імя М. Горкага ў Маскве.

У **1971** годзе скончыла аддзяленне мастацкага перакладу. Пасля заканчэння вучобы ў **1971-1972** была накіравана на пасаду рэдактара кінастудыі «Беларусьфільм».

**Таксама атрымала такія ўзнагароды як**

- **Літаратурная прэмія СП БССР імя А. Куляшова за кнігу лірыкі «Каханне» (1988)**
  .
- **Дзяржаўная прэмія Беларусі ў галіне літаратуры (1993).**





- **У 1972—1977** — карэспандэнт газеты «Літаратура і мастацтва»,
- З **1977** года Член Саюза пісьменнікаў СССР
- у **1983—1988** — літкансультант рэдакцыі газеты «Чырвоная змена».
-  У 2000—2002 гадах галоўны рэдактар часопіса «Алеся». Галоўны рэдактар часопіса «Маладосць». Супрацоўніца газеты «Літаратура і мастацтва» (2011—2012).

**Дэбютавала ў друку ў 1960 годзе. У зборніках паэзіі «*Рамонкавы бераг*» (1974), «*Слухаю сэрца*» (1978), «*Такое кароткае лета*» (1981), «*Адгукнуся голасам жалейкі*» (1984), «*Каханне*» (1987), «*Пад небам першага спаткання*» (1990), «*Люстэрка для самотнай*» (1992).**




**У творчасці дамінуе тэма кахання, прага высокага духоўнага ідэалу, роздум пра час, абавязак перад сваім народам, долю жанчыны, пошук чалавечага шчасця.**
**Таксама эпізоды беларускай гісторыі адлюстраваны ў вострасюжэтнай драматычнай паэме «*Барбара Радзівіл*» (199[illegible]).**

Самая істотная рыса паэтычнай творчасці — адкрытасць душы, прачулая музыка слова. Вершы і паэмы надзвычай эмацыянальныя, напоўненыя экспрэсіяй, вызначаюцца вытанчанасцю лірычных пачуццяў.



У паэзіі Р. Баравіковай свораны адметны жаночы лірычны характар, якому, у адрозненне ад актыўнага і рацыянальнага мужчынскага пачатку, уласцівы адчуццёвасць, мяккасць, абсвостраная трывога за ўсё жывое ў свеце, дабрыня і безаглядная ахвярнасць, прага суладдзя і пыгажосці.

Выступае Раіса Андрэеўна і як празаік. У 1980 годзе з’явілася яе аповесць «Кватарантка» пра моладзь, каханне, пошукі свайго месца ў жыцці

У індывідуальным светабачанні паэткі, па словах даследчыцы В. Шынкарнкі, пераважае жаночы захоплена-сузіральны і адначасова маральна-павучальны падыход. Сапраўды, Р. Баравікова не перастварае свет, а адлюстроўвае яго праз люстэрка сваёй, часцей самотнай, душы.

